# *ШКОЛА ЁСЦЬ ШКОЛА*

**14 мая створаная абласной пісьменніцкай арганізацыяй Гродзенская грамадская літаратурная школа сабралася на семінарскі занятак па тэме «Прэзентацыя творчасці. Крок 1». На шчасце, прадмет размовы для большай часткі прысутных аказаўся не новым. Да заўсёднікаў далучыліся новыя людзі, прыйшла зацікаўленая моладзь. А гэта значыць, што грамадска-адукацыйны літаратурны праект гродзенскіх пісьменнікаў, як казалі ў былыя часы, жыў, жывы і будзе жыць.**

Некалькі слоў аб пастаўленых мэтах. Па папярэдняй дамоўленасці з адміністрацыяй Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага там плануецца правядзенне паўнавартаснага літаратурнага мерапрыемства для шырокай грамадскасці, а менавіта прэзентацыі нашай грамадскай літаратурнай школы (год стварэння 2017-ы), яе дзейнасці, гісторыі і, вядома, творчасці саміх слухачоў.



Усё істотна ўскладняецца вялікай колькасцю патэнцыйных удзельнікаў ва ўмовах абмежаванага ліміту часу. Пакуль да канца незразумела, якімі павінны быць выступленні па часе і змесце. Не гатовы і канчатковы спіс удзельнікаў прэзентацыі. Гэтыя задачы неабходна вырашыць сумеснымі намаганнямі. Калектыў слухачоў праекта зацікаўлены не толькі ў разуменні яго надзённых мэтаў і задач, але і ўва ўзаемаразуменні адзін аднаго. У ходзе першай рэпетыцыі мерапрыемства кожны з выступоўцаў пастараўся адказаць на пытанні аўдыторыі, атрымаў у свой адрас некаторыя сяброўскія парады, рэкамендацыі экспертаў. Прагучалі творы аўтарскай паэзіі і прозы на рускай і беларускай мовах, а таксама кампліменты ў адрас праекта. Можна з упэўненасцю сказаць, што творчая атмасфера семінарскіх заняткаў Гродзенскай грамадскай літшколы характарызуецца ўзаемнай павагай і прыязнасцю. Ад удзельнікаў майскай сустрэчы прагучала цікавая прапанова – надаць прэзентацыі праекта не парадны, а менавіта працоўны характар – з уласцівымі нам калектыўным аналізам выступленняў, культуралагічнымі дыскусіямі, аргументаванай абаронай аўтарамі сваіх рашэнняў і г. д. Школа ёсць школа! Але і тут усё не так адназначна: рабочыя абмеркаванні выступленняў – дадатковы расход часу, а яго і так мала.

Падчас пасяджэнняў кожны жадаючы можа атрымаць тут каштоўныя веды і порцыю цэннага вопыту. Нагадаем: створаная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Грамадская літаратурная школа дзейнічае як у калектыўным, так і ўва індывідуальным фармаце (персанальныя літкансультацыі насельніцтва). Наперадзе – прэзентацыя праекта ў абласной бібліятэцы, здымкі на тэлебачанні, выязныя заняткі і шмат іншага. А гэта значыць, шмат не толькі літаратурнай, але і арганізацыйнай працы. І, вядома, наперадзе чарговыя семінарскія заняткі пад назвай «Прэзентацыя творчасці. Крок 2».

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота**: створаная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі грамадская літаратурная школа правяла семінарскія заняткі па тэме «Прэзентацыя творчасці. Крок 1». Офіс СПБ-Гродна, 14 мая 2026 года.




ГРАМАТА
ГРАМАТА
ДЫПЛОМ


СКАРБЫ


Кто ты, пред Вечностью стоящий?
СКАРБЫ ПАНЯМОННЯ
СОКРОВИЩА ПОНЕМАНЬЯ




ПЕРСОНА СТРАНЫ

АЗОВСКИЕ ЖЕМЧУЖИНЫ

2026 ГОД ЕДИНСТВА НАРОДОВ РОССИИ

# ДИПЛОМ

**награждается**

**Ирина Полудень**

за III место

в номинации «Что город – то норов, что дом – то обычай» (поэзия)

II Международного конкурса

«Азовские жемчужины-2026»

Жюри конкурса: Полякова М.В., Людмила Кулик-Куракова, Сляднева Н.Е., Татьяна Турбина, Сергей Майоров, Чернова А.В., Ольга Погорелова

Заслуженный деятель искусств РК — Т.Н. Жихарева

Директор ГБУ ОО ЗО «СОШ №4» — А.В. Момот

АЗОВСКИЕ ЖЕМЧУЖИНЫ

2026








СКАРБЫ ПАНЯМОННЯ


НЕМАН




СКАРБЫ ПАНЯМОННЯ
СОКРОВИЩА ПОНЕМАНЬЯ






СКАРБЫ
ПАНДЭМОНІЯ


СКАРБЫ
ПАНЯМОННЯ




СКАРБЫ ПАНЯМОННЯ






СКАРБЫ
ПАЦЯМОНІЦЯ








СКАРБЫ ПАНЯМОННЯ
СОКРОВИЩА ПОНЕМАНЬЯ





**Усе разам**
***Фота*** Анатоля Апанасевіча